В заключение необходимо отметить, что национальная экономика Туркменистана динамично развивается на протяжение всех 20 лет с момента создания Содружества Независимых Государств.

*УДК 82*

## ВАСІЛЬ ЦЯПІНСКІ – ПРАДАЎЖАЛЬНІК ТРАДЫЦЫЙ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

*Д.М. Норка – студент 1 курса БГАТУ*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык А.Б. Гурновіч*

Як вядома, 2012 год быў аб'яўлены Годам кнігі. Па ўсей краіне праведзена шмат мерапрыемстваў, прысвечаных развіццю кнігадрукарскай справы, ушанаванню нашага выдатнага першадрукара Францыска Скарыны, яго паслядоўнікаў Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага і іншых. Не абмінула гэта падзея і Чашніцкі раён Віцебскай вобласці – радзіму майго славутага земляка, беларускага пісьменніка, гуманіста, кнігавыдаўца Васіля Цяпінскага, імя якога зараз носіць школа ў вёсцы Цяпіна, дзе створаны і працуе краязнаўчы музей, у якім шмат экспанатаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю асветніка. Ля ўваходу ў школу ляжыць вялізны валун з былой сядзібы пісьменніка.

Дык хто ж такі Васіль Цяпінскі? У чым яго заслуга перад нашай краінай і народам?

Спынімся больш падрабязна на жыцці і дзейнасці пісьменніка.

Нарадзіўся Васіль Мікалаевіч Цяпінскі дзесьці ў сярэдзіне 30-х гадоў XVI ст., паходзіў з баярскага роду. Яго сапраўднае прозвішча Амельяновіч. Імя Цяпінскага ўпершыню ўпамінаецца ў дакументальных актах 1560-х г. У 1557 годзе ён малодшы афіцэр коннай роты аршанскага старосты Ф.С. Кміты-Чарнабыльскага. Удзельнічаў у Лівонскай вайне 1558-1582 г. Служыў у падканцлера Вялікага княства Літоўскага А.Б.Валовіча. Сёння няма звестак пра шмат якія перыяды жыцця Васіля Цяпінскага. Наўрад ці ён мог атрымаць высокую адукацыю дзе-небудзь у Заходняй Еўропе.

Цяпінскі быў з тых, хто добра разумеў значэнне кнігадрукавання як аднаго з важнейшых сродкаў у развіцці культуры, і таму ён, побач з Сымонам Будным, з якім быў добра знаёмы асабіста, з'явіўся адным з выдатнейшых паслядоўнікаў справы Ф. Скарыны. Дзесьці каля 1580 года ён у сваім маёнтку Цяпіне (адсюль і яго літаратурнае прозвішча) заснаваў друкарню, дзе і пачаў друкаваць побач з царкоўна-славянскім тэкстам перак-

ладзенае ім на беларускую мову "Евангелле" з прадмовай – адным з лепшых узораў беларускай патрыятычнай публіцыстыкі XVI ст. "Евангелле" надрукавана ў 2 слупкі – на царкоўна-славянскай і беларускай мовах, са шматлікімі глосамі і спасылкамі на літаратурныя крыніцы. Выданне ўпрыгожана разнастайнымі ініцыяламі, наборным арнаментам. Відавочная стылізацыя пад віленскія выданні Ф. Скарыны (падабенства шрыфтоў, ініцыялаў) сведчыць пра пераемнасць друкарска-выдавецкіх традыцый.

Асноўная праграма Цяпінскага разлічана на ўздым нацыянальнай культуры, умацаванне грамадскіх пазіцый беларускай мовы, абуджэнне актыўнасці, гістарычнай і нацыянальнай свядомасці беларускага народа. Як і Скарына, ён лічыў неабходным удасканальваць сістэму школьнай асветы, зрабіць яе больш даступнай, разнастайнай, адпаведнай патрэбам грамадства, у тым ліку простым людзям. Васіль Цяпінскі добра разумеў, што нацыянальнаму занядбанню, паланізацыі паддаюцца найперш верхнія саслоўі. І ён заклікае тых "... вялікіх княжат, паноў значных, іх дзетак нявінных, мужоў з жонамі" не выракацца "свайго дасціпнага вучонага народу". Ён нагадвае пра немінучую жорсткую Божую кару за вялікі грэх адступніцтва ад свайго народа.

В. Цяпінскаму добра былі бачны цяжкія наступствы шырокага і гвалтоўнага акаталічвання і паланізацыі тагачаснага беларускага грамадства, што не магло яго, як гарачага патрыёта, не хваляваць. Ён заклікае да рашучага супраціўлення гэтай навале. Дзейнасць В. Цяпінскага з'яўляецца яскравым выяўленнем таго процідзеяння варожай плыні, якое аказвалі патрыятычныя сілы беларускага грамадства таго часу.

Патрыятызм Цяпінскага далёкі ад нацыянальнай абмежаванасці. Ён з павагай адносіўся да народаў усіх краін, падкрэсліваў гістарычную, культурную і моўную роднасць славянскіх народаў. У яго творчасці прысутнічаюць выразныя дэмакратычныя тэндэнцыі, арыентацыя на ўвесь беларускі народ. Дзейнасць В. Цяпінскага спрыяла зараджэнню, уздыму і кансалідацыі шырокага нацыянальна-культурнага і патрыятычнага руху на Беларусі ў канцы XVI – пач. XVII стст. Цяпінскі цесна супрацоўнічаў з Сымонам Будным, часткова падзяляў яго грамадска-палітычныя і рэлігійныя погляды.

Літаратурна-публіцыстычная дзейнасць Васіля Цяпінскага - надзвычай яркая з'ява ў нашай літаратуры. Яна прасякнута гуманістычнымі ідэямі, шчырым і глыбокім патрыятызмам, клопатам пра будучыню народа.

Спадчына Васіля Цяпінскага, яго жыццёвы шлях яшчэ недастаткова поўна вывучаны. Новыя архіўныя дакументы і даследаванні дазволяць пашырыць гістарычныя звесткі аб жыцці Цяпінскага, яго сваяцкіх і сямейных сувязях.